**Г. Д. Чайка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі

**Ведаць і шанаваць родную мову**

## Выкарыстанне ўзроўневай дыферэнцыяцыі з мэтай павышэння эфектыўнасці адукацыйнага працэсу па беларускай мове

Змены ў грамадстве, палітыцы, культуры патрабуюць ад устаноў адукацыі падрыхтоўкі такога выпускніка, які будзе запатрабаваны грамадствам, здольны да самарэалізацыі, паспяховы. Таму перада мною як перад настаўнікам паўстала пытанне: як забяспечыць належны ўзровень адукацыі па прадмеце, стварыць умовы для рэалізацыі магчымасцей кожнага?

У выніку праведзенага сярод вучняў гімназіі анкетавання (Дадатак 3) я вызначыла, што 89% гімназістаў у паўсядзённым жыцці не выкарыстоўваюць і не чуюць беларускую мову, 62% не аддаюць перавагі тэлеперадачам, перыёдыцы і мастацкай літаратуры на беларускай мове, 71% вучняў сутыкаюцца з цяжкасцямі пры вывучэнні дадзенага прадмета. Але 87% гімназістаў заняткі па беларускай мове дапамагаюць у атрыманні камунікатыўных навыкаў, а 90% указваюць на значнасць індывідуальнага падыходу і выбару відаў заданняў на ўроках.

Такім чынам, мною была выяўлена неабходнасць дыферэнцаванага падыходу пры вывучэнні беларускай мовы. Гэта аднолькава актуальна і на II, і на III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі. Такі падыход станоўча ўплывае на псіхалагічны мікраклімат у класе і дазваляе кожнаму рэалізаваць свае магчымасці. Асабліва важна гэта ў перыяд адаптацыі. Анкета, праведзеная сярод пяцікласнікаў у пачатку навучальнага года і ў канцы чацвёртай чвэрці

паказала, што ўзровень адаптацыйнасці павысіўся з 70% да 87% (Дадатак 3). Неабходны дыферэнцаваны падыход падчас падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання: класаў з вывучэннем беларускай мовы на павышаным узроўні няма, урок па дадзеным прадмеце праводзіцца адзін раз на тыдзень, а стымулюючых заняткаў для падрыхтоўкі недастаткова.

Трэба адзначыць, што развіццё асобы ў адукацыйным працэсе адбываецца паспяхова пры ўмове, калі дзейнасць педагога абапіраецца на патрабаванні, магчымасці саміх вучняў. Менавіта настаўнік, на маю думку, павінен стварыць такую атмасферу на ўроку, каб кожны адчуваў сябе камфортна, не баяўся памыліцца і жадаў праявіць ініцыятыву, “стаць паўнапраўным суб’ектам жыццядзейнасці ў класе” [3, с.46]. Гэту праблему дапамагае вырашыць узроўневая дыферэнцыяцыя.

Сутнасць узроўневай дыферэнцыяцыі заключаецца ў наступным. Вырашаецца яна за кошт разнастайнасці метадаў і прыёмаў навучання. На ўроку мае месца групавая, індывідуальная, франтальная работа. Змест адукацыі і метады навучання падбіраюцца з улікам асаблівасцей дзяцей, прадугледжваецца варыятыўнасць тэмпу вывучэння матэрыялу, выбар розных відаў заданняў. Працэс арганізацыі настаўнікам узроўневай дыферэнцыяцыі на ўроках уключае ў сябе некалькі этапаў:

- вызначэнне крытэрыя, на аснове якога выдзяляюцца групы вучняў для дыферэнцаванай работы ( першым крытэрыем павінен выступаць узровень навучальнасці дзяцей);
- размеркаванне дзяцей на групы;
- рэалізацыя дыферэнцаванага падыходу да вучняў на розных этапах урока;
- дыягнастычны кантроль за вынікамі работы вучняў, у адпаведнасці з якімі можа мяняцца склад груп і характар дыферэнцаваных заданняў.

На думку А.У.Перавознага [4], якасць дыферэнцыяцыі залежыць ад клімату на ўроку, ад механізмаў яе рэалізацыі, ад вучэбна-метадычнага комплексу.

Неабходна заўважыць, што ёсць асаблівасці ў рэалізацыі дыферэнцаванага падыходу ва ўмовах навучання ў гімназіі. Гэта звязана з наяўнасцю вучэбнай матывацыі ў гімназістаў. Таму ў якасці крытэрыяў дыферэнцыяцыі я вызначаю наступныя :

-узровень ведаў,

-схільнасці да творчасці,

- тэмп засваення матэрыялу,

- асаблівасці псіхічнага складу асобы.

Для таго каб у вучняў не склаўся стэрэатып, што іх дзеляць на здольных і не вельмі, трэба абавязкова пракаменціраваць, па якіх крытэрыях гэта робіцца, з якой мэтай. Неабходна таксама адзначыць, што склад груп будзе ўвесь час змяняцца, што дазволіць дапамагчы кожнаму праявіць сябе, стаць лепшым.У першую групу аб'ядноўваюцца вучні з дастатковым запасам ведаў, схільныя да творчасці, якія валодаюць высокім узроўнем самастойнасці, хуткасцю засваення матэрыялу.

Другая група – вучні з сярэднімі магчымасцямі, якія патрабуюць выхавання самастойнасці і ўпэўненасці ў сваіх пазнавальных магчымасцях.

У трэцюю групу ўключаюцца не вучні з нізкай паспяховасцю ў выніку нізкіх здольнасцей, а вучні, якім у дадзены момант найбольш неабходна дапамога настаўніка: ёсць пэўныя незразумелыя пытанні ў вывучанай тэме, не атрымліваецца выканаць на патрэбным узроўні заданне і г.д. Таксама гэта вучні, якія, згодна сваім псіхалагічным асаблівасцям, могуць якасна працаваць толькі ва ўмовах пастаяннага ўзаемадзеяння з настаўнікам.

Трэба адзначыць, што групы не з'яўляюцца статычнымі, іх склад пастаянна змяняецца. Такім чынам даецца магчымасць кожнаму папрацаваць творча, самарэалізавацца, атрымаць у неабходны момант дапамогу.

Дыферэнцаваны падыход я выкарыстоўваю на ўроках па вывучэнні новага матэрыялу, на падагульняючых занятках, на ўроках камбінаванай будовы (Дадатак 1).

На першым этапе ўрока арганізую ўвагу, добразычлівы настрой, што дапамагае вучням мабілізавацца на работу. Звычайна гэта простыя словы прывітання або знаёмства з эпіграфам да ўрока, што акцэнтуе ўвагу і стварае камфортную атмасферу.

Наступны этап урока – праверка дамашняга задання, падрыхтоўка да ўспрымання новай тэмы. Дамашняе заданне правяраецца ў адной з груп (звычайна ў трэцяй), астатнія ў гэты час выконваюць практыкаванне па пройдзеным матэрыяле. Гэта можа быць арфаграфічная, граматычная, арфаэпічная размінка. Такім чынам актуалізуюцца набытыя веды і ўменні.

На наступным этапе пры фармуліроўцы тэмы і мэты абавязкова на дошцы запісваюцца ключавыя пытанні да ўрока (Дадатак 1). Гэта, я лічу, дапамагае ўсвядоміць кожнаму, над чым ён будзе сёння працаваць. Пачынаючы з пятых класаў, практыкую фармуліроўку мэт і задач самімі вучнямі, зыходзячы з названай тэмы.

Пры знаёмстве з новым матэрыялам у пятых-дзявятых класах я прапаную для аналізу моўныя адзінкі, стаўлю праблему, якую неабходна вырашыць (праца ідзе з усім класам). Гэты матэрыял аналізуецца вучнямі, і ў працэсе гутаркі робіцца пэўная выснова. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Правапіс у-ў” у пятым класе вучням прапаноўваюцца словы і спалучэнні слоў, якія размеркаваны ў некалькі груп у залежнасці ад умоў напісання у-ў. Стаўлю задачу: прааналізаваць дадзеныя словы і зрабіць вывад, ад чаго залежыць правапіс у-ў. Вучні выказваюць свае меркаванні і ў выніку фармулююць правілы правапісу у-ў. Зробленыя вывады запісваюцца ў выглядзе схем-адказаў побач з ключавымі пытаннямі. Такое спалучэнне праблемнай сітуацыі, аналізу і нагляднасці эфектыўна пры вывучэнні арфаграфіі, сінтаксісу. Гэта найбольш спрыяе ўсведамленню новых паняццяў, бо вучні самі робяць вывады, аналізуюць, а потым даюць адказы на пастаўленыя пытанні.

У 10-11 класах на гэтым этапе ўрока я выкарыстоўваю індывідуальную работу і работу ў парах. Вучні самастойна рыхтуюць паведамленне па пэўнай тэме, суправаджаючы яго нагляднасцю. Такія заданні даюцца на папярэднім

уроку. Напрыклад, тэма ўрока ў адзінаццатым класе – ”Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі”. Вучань узнаўляе матэрыял па дадзенай тэме, распрацоўвае апорную схему і выступае з паведамленнем перад класам. Трэба адзначыць, што індывідуальная работа ў сукупнасці з групавой асабліва актуальна ў адзінаццатым класе, што звязана з падрыхтоўкай да цэнтралізаванага тэсціравання. Вучні, якія вырашылі здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове, аб’ядноўваюцца ў асобную групу. Заданні для гэтай групы складаюцца адпаведныя, асаблівая ўвага надаецца тэстам па пэўных тэмах.

Наступны этап урока – замацаванне новага матэрыялу. Арганізуецца дзейнасць у групах па выкананні рознаўзроўневых заданняў. Спалучаецца самастойная работа вучняў з работай пад кіраўніцтвам настаўніка. На гэтым этапе вучні працуюць з тэкстам пэўнай выхаваўчай ці пазнавальнай тэматыкі.У 5-6 класах гэты тэкст звычайна запісваецца пад дыктоўку з каментарыем, што дазваляе ўзнавіць і замацаваць веды па арфаграфіі і пунктуацыі. У 8-11 класах ёсць розныя спосабы падачы. Тэкст можа быць прадстаўлены на картцы, у ім прапушчаны арфаграмы, знакі прыпынку. Могуць быць пададзены сказы ў хаатычным парадку, якія трэба паставіць у патрэбнай паслядоўнасці. Спосаб падачы выбіраецца ў залежнасці ад тэмы і мэты ўрока. Абавязкова гучыць доказ таго, што дадзеныя сказы з’яўляюцца тэкстам, вызначаецца яго тэма, ідэя, стыль, тып. Гэта важна для вучняў, бо такім чынам ідзе падрыхтоўка да шматаспектнага аналізу тэксту, што з’яўляецца важным для сістэматызацыі моўных ведаў.

Першая група ў пятых – дзявятых класах выконвае заданні творчага характару. Напрыклад, дапісаць тэкст уласнымі сказамі ці стварыць уласны тэкст пэўнага тыпу і стылю, улічыўшы дадатковыя заданні па новай тэме. Так, пры вывучэнні тэмы “Тыпы сказаў па мэце выказвання” ў пятым класе даецца наступнае дадатковае заданне: выкарыстаць у сваім тэксце апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя сказы. Вынікі работы першай групы падводзяцца на апошнім этапе ўрока, пры гэтым астатнія слухаюць і аналізуюць творчыя

работы, выказваючы свае заўвагі, уражанні. Практыкуецца рэцэнзаванне вучнямі адказаў аднакласнікаў. Гэта падабаецца вучням і, на мой погляд, з'яўляецца карысным, бо развівае вусную мову і творчыя здольнасці, што спрыяе самарэалізацыі асобы.

Для вучняў пятых-сёмых класаў мэтазгодна выкарыстанне гульнёвых формаў. Таму часта вучні першай групы атрымліваюць заданні на так званыя "хвіліны адпачынку". Гэта можа быць міні-інсцэніроўка, маналог. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы "Дыялог.Знакі прыпынку пры дыялогу" ў пятым класе прапаноўваецца скласці дыялог на пэўную тэму і праінсцэніраваць размову. Пры гэтым павінны быць выкарыстаны розныя па мэце выказвання і інтанацыі сказы. Падобныя заданні ўдасканальваюць камунікатыўныя ўменні і навыкі.

У дзясятых-адзінаццатых класах у першую групу аб'ядноўваюцца вучні, якія плануюць здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне па прадмеце.

Вучні другой і трэцяй груп на дадзеным этапе ўрока выконваюць заданні аналітычнага, аналітыка-сінтэтычнага характару, звяртаюцца да моўнага аналізу, перакладу. Яны рэканструююць сказы, выпісваюць словазлучэнні, замяняюць пэўныя выразы фразеалагізмамі, выконваюць марфемныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя разборы. Такія заданні выпрацоўваюць практычныя навыкі карыстання мовай. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы "Знакі прыпынку пры дзеепрыслоўным звароце" ў сёмым класе, вучням другой групы прапануецца сканструяваць сказ з дзеепрыслоўным зваротам з дадзеных слоў і словазлучэнняў, расставіць у ім знакі прыпынку і растлумачыць іх пастаноўку графічна. У гэты час вучні трэцяй групы разам з настаўнікам выпісваюць сказ з прапанаванага тэксту з дзеепрыслоўным зваротам, графічна тлумачаць пастаноўку знакаў прыпынку. Затым вучням трэцяй групы прапаноўваецца выпісаць з дадзенага сказа словазлучэнні і разабраць. Тым часам вучні другой групы займаюцца самаправеркай (правільны варыянт падаецца на дошцы). Затым настаўнік дае ім новае заданне: выканаць сінтаксічны разбор атрыманага сказа. Другая група прыступае да работы над новым заданнем, а настаўнік правярае, як закончылі разбор

словазлучэнняў вучні трэцяй групы. Пасля разам з імі расстаўляе знакі прыпынку ў прапанаваных сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі.

Такім чынам, вучні першай групы працуюць на ўроку самастойна. Вучні другой групы сумяшчаюць самастойную працу з працай пад кіраўніцтвам настаўніка. Вучні трэцяй групы працуюць пераважна разам з настаўнікам. Падчас праверкі задання адной групы другая працуе самастойна, трэцяя, напрыклад, займаецца самаправеркай ці знаёмствам з новым заданнем і г.д. Такім чынам, урок я будую так, што кожны вучань увесь час заняты справай, што дазваляе разгледзець большы аб'ём неабходнага матэрыялу, замацаваць уменні і навыкі.

На этапе падагульнення вучні самастойна падводзяць вынікі ўрока, карыстаючыся запісаным на дошцы па ходу ўрока алгарытмам. На гэтым жа этапе, на маю думку, мэтазгодна правесці падагульняючы міні-тэст з наступнай узаема- ці самаправеркай, што дазволіць кожнаму ўбачыць свае вынікі.Такім чынам арганізаваная рэфлексія дазваляе прааналізаваць ступень засваення матэрыялу вучнямі.

Дамашняе заданне даецца дыферэнцаванае. Вучні самі выбіраюць тое, што лічаць цікавым, карысным для сябе. Абавязкова я прапаную творчае заданне. На маю думку, сітуацыя выбару вельмі неабходна для развіцця індывідуальнасці, самаактуалізацыі магчымасцей вучня.

Тэматычны кантроль здзяйсняецца з дапамогай рознаўзроўневых заданняў, якія аб'ядноўваюцца ў адзін тэст і размяшчаюцца па меры павышэння ўзроўню складанасці (Дадатак 3). Кантрольныя і навучальныя дыктанты і пераказы даюцца аднолькавыя для ўсіх вучняў.

Дзякуючы такому спосабу арганізацыі навучальнага працэсу павышаецца ўзровень ведаў вучняў, з'яўляецца магчымасць дапамагаць кожнаму і развіваць кожнага; ствараецца атмасфера, калі дзеці камфортна сябе адчуваюць, не баяцца памыліцца, праявіць ініцыятыву, калі кожнаму адводзіцца час, адпаведны яго асабістым магчымасцям; ствараюцца ўмовы для творчай дзейнасці дзяцей, іх самарэалізацыі.

## Літаратура

1. Актуальные проблемы дифференцированного обучения / Л.Н.Рожина [и др.]; под ред. Л.Н.Рожиной. - Мн.: Нар.асвета, 1992.- 191 с.

2. Былінская, Л.С. Дыферэнцыраванае навучанне ў сучаснай школе / Л.С.Былінская // Беларуская мова і літаратура.- 2006.- №9. –с.29-34.

3. Запрудский, М.И. Современные педагогические технологии -2 / М.И.Запрудский. - Минск, 2010.- 256 с.

4. Перевозный, А.В. Условия эффективности дифференциации современного школьного образования /А.В.Перевозный // Проблемы педагогики и психологии. - 2012. - №1.- с.205.

Дадатак 1

**Тэма ўрока: Лексічнае значэнне слова (5 клас)**

Тып урока: камбінаваны.

**Мэта**: у канцы ўрока вучні павінны умець тлумачыць лексічнае значэнне прапанаваных слоў з дапамогай слоўніка, вызначаць спосаб акрэслівання лексічнага значэння, ведаць структурныя часткі слоўнікавага артыкула тлумачальнага слоўніка.

**Задачы**:

- спрыяць стварэнню ўмоў для засваення паняцця “лексічнае значэнне слова” і спосабаў яго акрэслівання;
- садзейнічаць узнаўленню ўменняў і навыкаў аналізу, творчых здольнасцей, мовы вучняў;
- спрыяць фарміраванню беражлівых адносін да прыроднага багацця.

**Абсталяванне:**

1. Бел.мова: вучэб.дапам. для 5-га кл.устаноў агульнай і сярэдняй адукацыі з бел.і рус. мовамі навучання: у 2 ч./ В.П.Красней (і інш.). - Мн.: Нац. ін-т адук., 2014.
2. Плакат з эпіграфам.
3. Карткі з тэкстам.

**Ход урока**:

*Эпіграф: “Нашы лясы - гэта нашых даброт і багацця невычарпальны калодзеж”* . (М.Гусоўскі)

Арганізацыйны момант. Уступнае слова настаўніка.

I. Праверка дамашняга задання (правяраецца заданне вучняў 3 групы). (1 група- вучні 5 узроўню, 2 група- 4 узроўню, 3 група- 3- узровень.)

Актуалізацыя ведаў.

-1, 2 групы (у гэты час) выконваюць самастойна заданне: спісаць, уставіўшы прапушчаныя літары, даць графічны каментарый.

*Лес, л..снічоўка, л..сны, л..сун, л..савік, л..сы, ..ліна, б..роза, ягады, ..скравы, б..жыць, б..рагчы, ..янне, в..сёлы, сп..шае..а.*

-1, 2 групы - самаправерка задання (правільны варыянт запісаны на дошцы). (*Лес, леснічоўка, лясны, лясун, лесавік, лясы, яліна, бяроза, ягады, яскравы, бяжыць, берагчы, ззянне, вясёлы, спяшаецца.)*

Пытанне настаўніка: “На якое правіла былі падабраны словы ў заданні?” (Прагназуемы адказ: правапіс галосных, падвоеныя і падоўжаныя зычныя.)

II. Вывучэнне і замацаванне новага матэрыялу.

Настаўнік: ”Невыпадкова першым словам у заданні было слова ”лес”. Давайце звернемся да выказвання М. Гусоўскага, якое з’яўляецца эпіграфам да сённяшняга ўрока.”

Пытанне настаўніка: ”Як вы разумееце значэнне слова “невычарпальны”? А як вы разумееце сэнс выказвання М. Гусоўскага?“(Адказы вучняў.)

Настаўнік: ”Сёння мы павядзём гаворку пра лясы, якімі так багата наша Беларусь, пра іх ролю ў нашым жыцці. Адначасова працягнем гутарку па раздзеле “Лексіка”. Каб сфармуляваць навучальную тэму ўрока, узгадайце, што я вас прасіла растлумачыць, перш чым раскрыць сэнс выказвання?” (Лексічнае значэнне.)

Вучні запісваюць дату і тэму ўрока.

Настаўнік: ”Сёння мы правядзём даследчую работу і дадзім адказ на наступныя пытанні (пытанні запісаны на дошцы, туды ж па ходу ўрока запісваюцца і адказы):

- Што такое лексічнае значэнне слова?
- Спосабы яго акрэслівання?
- Будова слоўнікавага артыкула тлумачальнага слоўніка?

Настаўнік: ”На першае пытанне вы ўжо можаце даць адказ (прагназуемы адказ: гэта тое, што абазначае слова). У заданні, якое вы выконвалі на пачатку ўрока, было слова “яліна”. Падбярыце да яго сінонім”. (Елка.)

Настаўнік: ”А зараз давайце звернемся да тлумачальнага слоўніка, выпішам лексічнае значэнне слова “яліна” (слоўнік змешчаны ў падручніку).

Вучань выконвае заданне на дошцы. Настаўнік расказвае пра будову артыкула і разам з вучнем выдзяляе структурныя часткі. Запісваецца адказ на 3 пытанне ўрока. (Загаловак, граматычная характарыстыка, лексічнае значэнне, прыклад.)

Пытанне настаўніка: ”Як раскрываецца лексічнае значэнне слова “яліна”? (Праз сінонім.) Запісваецца адказ на другое пытанне.

- 1 група атрымлівае заданне: напісаць сачыненне-мініяцюру “Лес у нашым жыцці”, выкарыстоўваючы розныя па мэце выказвання сказы і словы з самастойнага задання для 1-й -2-й груп.

- 2 і 3 групы працуюць з тэкстам. (Тэкст падаецца на картках і запісаны на дошцы.)

- 2 група спісвае тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку. (Самастойна.)

*Лес сустракае нас прыемным пахам кветак смалы. Пр..ветна вітаюцца з намі з..лёныя хвойкі. Разб..гся па верасе малады бярэзнік. Узвыш..юцца сталыя дубы, як асілкі. Звіні..ь грае ў галінах ветрык сваю пес..ню. Наш адка.. на гасціннас..ь- ашчадныя адносіны да гэтага багацця.*

- 3 група працуе пад кіраўніцтвам настаўніка. Заданне: уставіць прапушчаныя літары і растлумачыць арфаграмы. (*Прыветна, зялёныя, разбегся, узвышаюцца,звініць, песню, адказ, гасціннасць*.)

Праверка задання 2 групы.(3 група ў гэты час спісвае першы сказ тэксту.) Пасля тэкст , у якім былі ўстаўлены прапушчаныя літары і знакі прыпынку,чытаецца адным з вучняў, вызначаецца яго тып і стыль, тэма і асноўная думка.

(*Лес сустракае нас прыемным пахам кветак, смалы. Прыветна вітаюцца з намі зялёныя хвойкі. Разбегся па верасе малады бярэзнік. Узвышаюцца сталыя дубы, як асілкі.Звініць, грае ў галінах ветрык сваю песню. Наш адказ на гасціннасць- ашчадныя адносіны да гэтага багацця.)*

Пытанне настаўніка: ”Так. Лес дорыць нам свае багацці, а мы павінны адказаць яму беражлівасцю. Што мы можам зрабіць з гэтай мэтай?”(Адказы вучняў.)

- 2 група прыступае да выканання задання: фанетычны разбор слова “багацце”. (Адзін вучань з групы працуе за дошкай.)

- 3 група разам з настаўнікам выконвае заданне: сінтаксічны разбор сказа, выпісанага раней (першы сказ з тэксту). *Лес сустракае нас прыемным пахам кветак, смалы.(Сказ просты, апав., някл., двухсаст., развіты, ускладнены аднародн. членамі.*)

- Праверка задання 2 групы.( 3 група ў гэты час спісвае фанетычны разбор слова з дошкі.)

- Замест фізпаўзы - *гульня "Правер кемлівасць".* Настаўнік: "Працягваем гаворку пра лес і дары, якія ён нам дае. Адгадайце, пра якія з іх ідзе размова. Адгадкі запішыце". (Работа ідзе з 2-ма групамі.)

Загадкі: 1. У траве, як аганькі, ружавеюць вугалькі, іх вадою не зальеш, рук і ног не апячэш. (Суніцы.) 2. Хоць у капелюшы, але галавы не мае. (Грыб.) 3. У маленькім гаршочку кашка смачненькая. (Арэх.) 4. Цяпло прыйдзе – апранаецца, холад настане – распранаецца. (Дрэва.)

Пытанне настаўніка: "Як вы здагадаліся, аб чым ідзе размова?" (Даецца апісанне прадмета.)

Настаўнік: "Апісанне – яшчэ адзін спосаб раскрыцця лексічнага значэння." (Запісваецца адказ на пытанне ўрока.)

- Заданне даецца 2 і 3 групам: растлумачце значэнне слова "дрэва" спосабам апісання. Складзіце слоўнікавы артыкул. Вылучце ў ім структурныя часткі. (Прагназуемы адказ: дрэва/-а, н. Расліна з цвёрдым ствалом.)

Настаўнік: "Яшчэ лексічнае значэнне можна тлумачыць шляхам перакладу". (Запісваецца адказ на пытанне ўрока.)

- Заданне даецца 2 і 3 групам:пераклад слоў : *оберегать, сохранять, сокровище, обязанность.(Берагчы, захоўваць, скарб, абавязак.)*

- Заданне 2 групе ( самастойнае): скласці і запісаць з дадзенымі словамі сказ.

- Вучні 3 групы працуюць разам з настаўнікам над заданнем: скласці з дадзенымі словамі словазлучэнні і разабраць. ( Адзін з вучняў працуе ля дошкі.)

- Праверка задання 2 групы.(Вучні зачытваюць уласныя сказы.)

- Праверка задання 1-ай творчай групы.(Астатнія слухаюць і заўважаюць, якія сказы па мэце выказвання былі выкарыстаны.)

III. Падвядзенне вынікаў.

- Падвядзенне вынікаў па выхаваўчай  тэме. Пытанне настаўніка: ” Якую ролю ў нашым жыцці адыгрываюць лясы? Што можа зрабіць кожны з нас з мэтай захавання ляснога багацця?”

- Падвядзенне вынікаў па навучальнай тэме адным з вучняў, абапіраючыся на пытанні, запісаныя на дошцы і адказы, пададзеныя тут жа.

Настаўнік:” А зараз кожны з вас праверыць, наколькі ён засвоіў матэрыял”.

- Выніковы тэст “Так ці не”(для ўсіх груп):

1. Лексічнае значэнне слова можна знайсці ў арфаграфічным слоўніку.
2. Лексічнае значэнне можна растлумачыць толькі  шляхам  апісання.
3. Лексічнае значэнне- гэта тое, што абазначае слова.
4. Лексічнае значэнне можна знайсці ў тлумачальным слоўніку.
5. Ёсць некалькі спосабаў акрэслівання лексічнага значэння.

V. Дамашняе заданне: §15, пр. 96 або скласці крыжаванку “Лясныя дары”.

Дадатак 3

**Анкета для вучняў**

1. Ці размаўляеце вы па-беларуску ў пазаўрочны час?
2. Ці чуеце вы беларускую мову ў паўсядзённым жыцці?
3. Ці аддаеце вы перавагу тэлеперадачам, выданням перыядычнага друку і мастацкай літаратуры на беларускай мове?
4. Ці сутыкаецеся вы з цяжкасцямі пры вывучэнні беларускай мовы?
5. Ці дапамагаюць вам урокі беларускай мовы атрымаць неабходныя камунікатыўныя ўменні і навыкі?
6. Ці неабходны вам выбар відаў заданняў і індывідуальны падыход на ўроках беларускай мовы?

**Анкета для вучняў 5 класа ”Узровень адаптацыйнасці на ўроку”**

1.Мне цікава, зразумела і неабходна інфармацыя, якую настаўнік мне прапануе.
2. Мне зразумелы спосабы работы, якія прапануе настаўнік.
3. Мне даецца магчымасць па жаданні працаваць у парах і групах.
4. Настаўнік дае мне магчымасць выбару заданняў разнастайнай складанасці.
5. Я самастойна ацэньваю вынікі сваёй работы на разнастайных этапах урока.

6. Я адчуваю і прымаю дапамогу і падтрымку з боку настаўніка.
7. Я маю права на памылку і сваю думку.
8. Мне даецца магчымасць палепшыць выпадковую ці нездавальняючую мяне адзнаку.

Прачытайце пытанні і ля кожнага пазначце бал, які адпавядае вашаму адказу. Заўсёды – 3 балы,часткова – 2 балы, іншы раз – 1 бал, ніколі – 0 балаў.

**Тэставыя заданні па тэме "Словазлучэнне"( 8 клас)**

1. Выпісаць спачатку сказы, потым словазлучэнні.

Прыемна слухаецца. Валя не слухаецца. Захапляецца словам. Ці былі вы ў горадзе? Казачны герой. Добры характар.

2. Вызначце ў словазлучэннях галоўнае і залежнае слова.

Гурбы снегу, хварэць на грып, прыгожая чырвоная кветка, хутка ісці, выйсці з дома, прыехаць у Мінск, паслухмяны хлопец.

3. Складзіце словазлучэнні.

А)працаваць (у, на) лес, калгас, завод, ферма; б) пайсці (у, на) луг, поле, сад, фабрыка; в) прыехаць (з, са) горад, Мінск, праца, служба.

4. Утварыце словазлучэнні"дзеяслоў+ займеннік".

Дзякаваць(яна), думаць( ты) , камандаваць(мы), падысці(ён).

5. Выпішыце словазлучэнні, якія адпавядаць нормам беларускай мовы.

Ісці па ваду, ісці за вадой, збірацца за грыбамі, збірацца ў грыбы, збірацца па грыбы, жартаваць над ім, жартаваць з яго, падзякаваць вас, падзякаваць вам, ісці к берагу, ісці да берага.

6. Утварыце словазлучэнні.

Пайсці з (Пеця), сустрэцца з (суддзя), белы (іней), убачыць (вожык), пайсці па (палі), падзяліўшыся з (дзеці), плывучы па (рака), сустрэцца ў (Мазыр).

7. Утварыце словазлучэнні "дзеяслоў+займеннік", устаўляючы адпаведны прыназоўнік.

Адпачыць(я, ты, ён); даведацца( я, ён, вы).

8. Перакладзіце на беларускую мову словазлучэнні.

Благодарить родителей, смеяться над младшим, красивый тополь, быстро идти, горькая полынь.

9. Пабудуйце словазлучэнні з наступнымі граматычнымі значэннямі.

Прадмет і яго прызначэнне, прадмет і яго адносіны да месца, прадмет і яго адносіны да часу.

10. З наступнымі словамі складзіце словазлучэнні. Каб ад іх залежаў назоўнік.

Большы, храбрыцца, вучыцца, пайсці.

**Тэставыя заданні па тэме "Лексіка" 5 клас**.

1. Падкрэсліце адной рыскай словы вядомыя і зразумелыя ўсім (агульнаўжывальныя), дзвюма- словы, значэнне якіх растлумачыць цяжка (словы абмеж. ужытку).

Міхась ужо даўно пагнаў тавар.

2. Складзіце сказы з дадзенымі словамі.

Снег, раніца.

3. У якіх значэннях ужыта слова "разбіць" у наступных словазлучэннях (карыстайцеся даведкай).

Разбіць атрад на групы, разбіць ворага, разбіць шклянку.

Даведка: падзяліць, перамагчы, раскалоць.

4. Растлумачце лексічнае значэнне дадзеных слоў, складзіце слоўнікавы артыкул.

Бегчы, дождж.

5. Выпішыце словазлучэнні, дзе словы ўжыты ў пераносным значэнні.

Свінцовая куля- свінцовая хмара; хвост лісы- хвост цягніка; спіць дзіця- спіць рака.

6. Складзіце словазлучэнні з мнагазначнымі словамі, каб былі зразумелы іх значэнні.

Крыло, пяро.

7. Спішыце, падкрэсліце амонімы, растлумачце іх значэнні.

Тваіх ільноў не адсінее неба,

Блакіт не адзвініць, як лёд тугі

А вачам дзядзькі Уладзіслава не ведаць ані воблачка тугі.

8. Складзіце сказы з наступнымі амонімамі.

Бабка(1)- матчына або бацькава маці.

Бабка(2)- страва, прыгатаваная з дранай бульбы.